Известия Гомельского государственного университета
имени Ф Скорины, № 4 (127), 2021

*УДК 94(476)*

# Падрыхтоўка навуковых кадраў па біялагічных навуках у АН БССР (другая палова 1940-х – сярэдзіна 1950-х гг.)

С.А. Жук

У артыкуле разглядаюцца пытанні арганізацыі падрыхтоўкі навуковых кадраў па біялагічных навуках у АН БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Паказаны асноўныя дасягненні айчыннай навукі ў распрацоўцы гэтай праблемы. Прааналізаваны планы і арганізацыйнае развіццё даследчых устаноў біялагічнага профілю. Рэканструявана дынаміка падрыхтоўкі даследчыкаў і зроблена ацэнка яе эфектыўнасці.

**Ключавыя словы:** Акадэмія навук, падрыхтоўка кадраў, прыродазнаўчыя навукі, аспірантура.

The article deals with the organization of training of scientific personnel in biological sciences in the Academy of Sciences of the BSSR in the first post-war decade. The main achievements of Russian science in the development of this problem are shown. The plans and implementation of the organizational development of biological research institutions are analyzed. The dynamics of scientific personnel training is reconstructed and its effectiveness is evaluated.

**Keywords:** Academy of Sciences, personnel training, natural sciences, postgraduate studies.

Аднаўленне і развіццё АН БССР у пасляваенны час дэтэрмінавала актывізацыю НДР у галіне прыродазнаўчых і дакладных дысцыплін. Ужо падчас вяртання ў Мінск перад ёй паўсталі пытанні па развіцці прыярытэтных напрамкаў савецкай навукі, сярод якіх была і біялогія. Для павышэння якасці даследчай работы патрабавалася ў кароткія тэрміны ўзмацніць кадравую складовую даследчых устаноў за кошт запрашэння спецыялістаў, а таксама арганізаваць эфектыўную сістэму падрыхтоўкі кадраў.

Гісторыя развіцця прыродазнаўчых дысцыплін у БССР фрагментарна разглядалася ў юбілейных зборніках, прысвечаных 30-, 40- і 50-годдзю АН БССР. Аднак у гэтых выданнях акцэнт зроблены на выніку і дасягненні навукоўцаў, арганізацыйна-кадравай складовай увагі фактычна не надаецца [1]–[3]. Напрыклад, у кнізе 1949 г. дырэктар Інстытута біялогіі М.А. Дарожкін засяроджвае ўвагу на выніку даследаванняў па абароне раслін ад хвароб, а член-карэспандэнт А.І. Лапо – на дасягненні беларускай селекцыі [1, с. 354, 364].

На некаторыі пытанні падрыхтоўкі навукоўцаў у галіне біялагічных навук звяртаецца ўвага ў даследаваннях В.Ф. Купрэвіча, М.І. Галенчыка, Г.У. Карзенкі, М.У. Токарава, а таксама ў юбілейнай гісторыі АН БССР (1979 г.) [4]–[9]. В.Ф. Купрэвіч вызначаў біялагічныя навукі як перспектыўную зону росту навуковага патэнцыялу, а таксама лічыў неабходным павялічваць наборы па гэтым навуковым напрамку. М.І. Галенчык прасачыў дынаміку навучання аспірантаў па біялагічных навуках у БССР [5], а М.У. Токараў паказаў умовы развіцця сістэмы падрыхтоўкі навуковых кадраў у АН БССР [6]. Пытанні інтэнсіфікацыі навукі, пошуку аптымальных форм змены пакаленняў навукоўцаў прысвечаны работы Г.А. Несвятайлава [10].

Такім чынам, гісторыя аднаўлення і развіцця сістэмы падрыхтоўкі навукоўцаў–біёлагаў у АН БССР не станавілася прадметам спецыяльнага навуковага даследавання. У айчыннай навуцы не выяўлены дастатковы эмпірычны матэрыял, а таму не асэнсаваны асаблівасці функцыянавання гэтай сістэмы. Актуальнасць даследавання вызначаецца, з аднаго боку, неабходнасцю мадэрнізацыі беларускай навукі, а, з другога – значнай роляй прыродазнаўчых навук у навукова-тэхнічным прагрэсе краіны.

Таму мэтай артыкула з'яўляецца вызначэнне тэндэнцый аднаўлення і развіцця акадэмічнай аспірантуры ў галіне біялагічных навук. Для дасягнення мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

1. Паказаць умовы арганізацыі навучання навукоўцаў-біёлагаў;
2. Выявіць эвалюцыю накірункаў і эфектыўнасць сістэмы падрыхтоўкі кадраў у галіне біялагічных навук.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Арганізацыя навучання даследчыкаў у галіне біялагічных навук.** Перш за ўсё, заўважу, што ў межах артыкула разглядаецца развіццё сістэмы падрыхтоўкі навуковых кадраў у даследчых установах біялагічнага профілю. Аднак у першыя пасляваенныя гады навучанне, напрыклад, спецыялістаў па генетыцы арганізавана ў Інстытуце сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. У 1930-ыя гг. у структуры Акадэміі існаваў Інстытут біялагічных навук і Батанічны сад. Для паўторнага адкрыцця профільных акадэмічных устаноў былі патрэбны не толькі кадры, але і значныя матэрыяльна-тэхнічная і лабараторная база. Напрыклад, у Батанічным садзе падчас вызвалення Мінска спалены вегетацыйны павільён, пацярпелі калекцыі адкрытага грунту і аранжарэй [11, арк. 21]. Ужо ў пачатку 1945 г. на пасяджэнні Прэзідыуму АН БССР разглядаліся пытанні па паскарэнні разгортвання НДР у ім і стварэнні арганізацыйнай структуры (аддзелы флоры, геабатанікі, фізіялогіі раслін, сыравінных рэсурсаў, памалогіі, дэндралогіі, дэкаратыўнага садоўніцтва) [11, арк. 24]. Кадравы патэнцыял Батанічнага сада складаўся з эвакуяваных, а таксама супрацоўнікаў, якія працавалі ў ім падчас акупацыі (член-карэспандэнт М.П. Тамін, навуковыя супрацоўнікі П.Ф. Лысаконь, І.М. Сяржанін і І.В. Маркаў) [12, арк. 54].

З 1944 г. мелі месца спробы аднаўлення акадэмічнай аспірантуры, у выніку якіх першы пасляваенны набор праведзены ў 1945 г. Батанічны сад стаў базай для падрыхтоўкі даследчыкаў па лесазнаўству, батаніцы і заалогіі [13]. Ужо ў 1945–1946 г. у Інстытут сацыялістычнай сельскай гаспадаркі прынята 3 чалавекі па спецыяльнасці «Генетыка і селекцыя», навуковым кіраўніком каторых прызначаны А.Р. Жэбрак [14]. Аднак пасля звальнення і «суду гонару» над Антонам Раманавічам падрыхтоўка даследчыкаў па гэтым профілі на некаторы час перапынілася.

У снежні 1947 г. шляхам рэарганізацыі Батанічнага сада ствараецца Інстытут біялогіі, у склад якога ўвайшлі аддзелы эксперыментальнай эвалюцыі, заалогіі, фізіялогіі раслін і непасрэдна Батанічны сад [15, арк. 233]. Адпаведна і падрыхтоўка аспірантаў пераводзілася ў зноў арганізаваную НДУ. На этапе яе станаўлення ў Аддзяленні і Прэзідыуме адбываліся шматлікія дыскусіі аб профілі і напрамках дзейнасці. Так, напрыклад, у дакументах справаводства Акадэміі 1947–1949 гг. установа сістэматычна называецца Інстытутам батанікі.

У 1948 г. пасля прызначэння Прэзідэнтам М.І. Грашчанкава распрацоўваецца праект развіцця інстытуцыянальнай асновы, які часткова падтрымліваецца сакратаром ЦК М.І. Гусаравым [16, арк. 293–295]. Згодна «Праекта Грашчанкава» ў 1948 г. планавалася раздзяліць Інстытут біялогіі на Інстытут батанікі і сектар заалогіі, які б непасрэдна падпарадкоўваўся Прэзідыуму, а ў 1950 г. з Інстытута батанікі павінен быў выведзены Інстытут эксперыментальнай біялогіі, а сектар заалогіі трансфармаваны ў Інстытут [17, арк. 37, 38]. Аднак гэты план не рэалізаваўся падчас прэзідэнцтва Мікалая Іванавіча, на што паўплываў запаволены рост навуковых кадраў і матэрыяльна-тэхнічнай базы. Не меншае значэнне мела і даволі жорсткая пазіцыя сакратара ЦК М.С. Патолічава, згодна якой пытанне аб арганізацыі НДІ ў структуры Акадэміі навук магло ставіцца толькі пасля станоўчых вынікаў у навуковых праектах.

Развіццё даследчых работ па біялагічных навуках паскараецца ў пачатку 1950-х гг., асабліва пасля прызначэння Прэзідэнтам В.Ф. Купрэвіча. Ужо згодна пастановы ЦК КП(б)Б (май 1952 г.) «Аб стане работы ў Інстытуце біялогіі АН БССР» са складу даследчай установы прапаноўвалася вывесці Батанічны сад [18, арк. 33–35]. Аднак гэта рашэнне не было рэалізавана. У 1953 г. праверку дзейнасці Акадэміі навук ажыццяўляла «камісія В.П. Нікіціна». Згодна яе вынікам прапаноўвалася раздзяліць Інстытут біялогіі на Інстытуты батанікі і заалогіі [19].

У 1954 г. на падставе праекта Прэзідыума АН БССР і запіскі начальніка аддзела навукі і ВНУ К.П. Буслава ЦК КПБ прыняло пастанову аб рэарганізацыі Інстытута біялогіі ў Інстытут батанікі шляхам вывядзення сектара фауны, які станавіўся самастойным аддзелам пры Прэзідыуме. Аднак і гэтае рашэнне не было рэалізавана [20, арк. 11]. Толькі ў 1958 г. арганізоўваецца аддзел заалогіі і паразіталогіі пры Прэзідыуме.

У сярэдзіне 1950-х гг. акадэмічнае кіраўніцтва сістэматычна праводзіла работу па стварэнні новых даследчых устаноў біялагічнага профілю. Вынікі гэтай працы пачалі праяўляцца толькі ў канцы 1950-х – пачатку 1960-х гг. пасля стварэння самастойнай лабараторыі біяфізікі і ізатопаў, аддзела фізіялогіі і сістэматыкі ніжэйшых раслін, генетыкі і цыталогіі. Такім чынам, ужо з 1950-х гг. прасочваецца тэндэнцыя мадэрнізацыі навуковай работы ў галіне біялагічных навук, перш за ўсё, шляхам інстытуцыяналізацыі новых накірункаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Зразумела, што аднаўленне і развіццё акадэмічнай біялагічнай навукі ў БССР патрабавала пільнай увагі да фарміравання сістэмы падрыхтоўкі навуковых кадраў. Як адзначалася вышэй, працэсы адраджэння аспірантуры і НДУ біялагічнага профілю адбываліся фактычна паралельна. Адной з асаблівасцяў савецкай мадэлі падрыхтоўкі даследчыкаў з'яўляецца яе планавы характар. У разглядаемы перыяд асноўнымі формамі планавання былі перспектыўнае і гадавое. У сярэдзіне 1940-х – сярэдзіне 1950-х гг. кіраўніцтвам АН БССР падрыхтаваны планы на 1946–1950, 1948–1950 і 1951–1955 гг. [21]–[23].

Табліца 1 – Планаванне набораў аспірантаў па ўстановах біялагічнага профілю (1945–1955 гг.)

| **Спецыяльнасць** | **Год** | | | | | | | | | | | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1945 | 1946 | 1947 | 1948 | 1949 | 1950 | 1951 | 1952 | 1953 | 1954 | 1955 | |
| Заалогія | 1 | 0 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 | 1 | 1 | **5** |
| Батаніка | 2 | 0 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | **3** |
| Біялогія | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | **1** |
| Геабатаніка | 0 | 0 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | **1** |
| Аграхімія | 0 | 0 | 0 | 2 | 1 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | **4** |
| Аграфізіялогія | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 1 | 0 | 0 | 0 | 1 | **4** |
| Селекцыя і насенняводства | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | **2** |
| Раслінаводства | 0 | 0 | 0 | 1 | 2 | 2 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | **5** |
| Глебазнаўства | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | **3** |
| Фітапаталогія | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | **2** |
| Сістэматыка раслін | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 | 1 | 0 | **2** |
| Садоўніцтва | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 0 | 1 | 0 | 0 | **2** |
| Абарона раслін | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 0 | **2** |
| **Усяго** | **4** | **0** | **3** | **4** | **7** | **7** | **2** | **2** | **2** | **3** | **2** | **36** |

Асаблівасцю планавання прыёмаў аспірантаў у другой палове 1940-х гг. з'яўляецца амбіцыйнасць, што тлумачыцца пануючым у той час меркаваннем аб магчымасці надзвычай хуткага аднаўлення кадравага патэнцыялу навукі, каб да 1950 г. не толькі дасягнуць даваенных паказчыкаў, але і пераўзыйсці іх. Карэкцыя першага пяцігадовага плана звязана са спробамі каардынацыі падрыхтоўкі навукоўцаў у БССР згодна пастанове Бюро ЦК КП(б)Б (кастрычнік 1947 г.) «О положении с научно-педагогическими кадрами в БССР» [24, арк. 103]. З праектамі на першую палову 1950-х гг. адбываецца адваротная сітуацыя. Нягледзячы на паляпшэнне стану кадраў Інстытута біялогіі, планаванне прагрэсу ў вырашэнні пытанняў прыродазнаўчых навук планам прадугледжваліся сціплыя прыёмы аспірантаў. На працягу пасляваеннага дзесяцігоддзя значна ўдакладнілася і прапрацоўка спецыяльнасцяў аспірантуры. У сярэдзіне 1940-х гг. кіраўніцтва Акадэміі навук і БССР зрабіла некалькі спроб арганізацыі дактарантскай аспірантуры па біялагічных навуках. Напрыклад, згодна плана на 1946–1950 гг. планавалася прыняць 8 чалавек [22, арк. 8]. Аднак пасля рэформы дактарантуры 1947 г. актывізуецца прыкамандзіраванне супрацоўнікаў АН БССР да НДІ саюзнай акадэміі.

**Падрыхтоўка навуковых кадраў па біялагічных навуках.** Асноўнай формай падрыхтоўкі навукоўцаў у пасляваеннае дзесяцігоддзе з'яўлялася аспірантура, якая існавала ў дзвюх формах: з адрывам ад вытворчасці (з 1945 г.) і без адрыву ад вытворчасці (з 1948 г.). У Інстытуце біялогіі большасць аспірантаў навучалася вопытнай базе, якой не існавала ў іншых навуковых установах. Таксама ўплываў на прыярытэтнае развіццё гэтай формы навучання і падбор аспірантаў, большасць з якіх залічваліся пасля заканчэння ВНУ па рэкамендацыях Вучоных саветаў. Фактычна кіраўніцтва Інстытута біялогіі не магло рэалізоўваць ідэі шэрагу нарматыўных актаў, згодна якім прадугледжвалася прыцягненне ў аспірантуру схільных да навукі людзей, якія мелі вопыт работы па спецыяльнасці. Разам з акадэмічнай аспірантурай функцыянаваў інстытут экстэрнату, які дазваляў навуковым супрацоўнікам здаць кандыдацкія экзамены. З другой паловы 1940-х гг. пачала атрымліваць распаўсюджванне, хаця і нязначна, практыка прыкамандзіравання аспірантаў да ўстаноў АН СССР. Аднак найбольш шматлікай з'яўлялася менавіта акадэмічная аспірантура.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Табліца 2 – Падрыхтоўка аспірантаў па біялагічных навуках у АН БССР (1945–1955 гг.)

| Спецыяльнасць | Год | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1945 | 1946 | 1947 | 1948 | 1949 | 1950 | 1951 | 1952 | 1953 | 1954 | 1955 |
| **Батанічны сад** | | | | | | | | | | | |
| Лесазнаўства | 1 | 1 | 1 | – | – | – | – | – | – | – | – |
| Заалогія | 1 | 1 | – | – | – | – | – | – | – | – | – |
| Батаніка | 2 | 2 | 3 | – | – | – | – | – | – | – | – |
| **Інстытут біялогіі** | | | | | | | | | | | |
| Батаніка | – | – | – | 2 | – | – | – | 4 | 5 | 4 | – |
| Лесазнаўства | – | – | – | 1 | – | – | – | – | – | – | – |
| Фітапаталогія | – | – | – | – | 3 | 4 | 5 | 3 | 3 | – | – |
| Сістэматыка вышэйшых раслін | – | – | – | – | – | 1 | 1 | 5 | 3 | – | 2 |
| Заалогія | – | – | – | – | 1 | 1 | 1 | 4 | 4 | 3 | 2 |
| Фізіялогія раслін (біяхімія) | – | – | – | – | – | – | 1 | 3 | 3 | 4 | - |
| Ніжэйшыя расліны | – | – | – | – | – | – | 1 | – | – | 1 | 2 |
| Мікалогія | – | – | – | – | – | – | 1 | – | – | – | – |
| Энтамалогія | – | – | – | – | – | 1 | 1 | – | – | 1 | 2 |
| Палеабатаніка | – | – | – | – | – | – | – | 1 | 1 | – | – |
| Генетыка | – | – | – | – | – | – | – | 1 | 4 | 4 | 3 |
| Травяныя расліны | – | – | – | – | – | – | – | - | – | 1 | – |
| Іхтыялогія | – | – | – | – | – | – | – | – | – | 2 | 2 |
| Мікрабіялогія | – | – | – | – | – | – | – | – | – | 2 | – |
| Геабатаніка | – | – | – | – | – | – | – | – | – | – | 2 |
| **Усяго** | **4** | **4** | **4** | **3** | **4** | **7** | **11** | **21** | **23** | **22** | **15** |

Падрыхтоўка навукоўцаў арганізоўвалася ў адпаведнасці з Палажэннямі «Аб аспірантуры» і палітыка-прававымі актамі, сярод якіх трэба вылучыць пастановы ЦК УКП(б) (ліпень 1947 г.) «О подготовке научно-педагогических кадров через аспирантуру», «О подготовке научно-педагогических и научных кадров через аспирантуру» (май 1948 г.) і «О мерах по улучшению подготовки и аттестации научных и педагогических кадров» (жнівень 1956 г.), пастанову ЦК КП(б) «Аб становішчы і мерах паляпшэння падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў праз аспірантуру ў Беларуская ССР» (снежань 1951 г.) [25]–[26].

Двойчы за пасляваеннае дзесяцігоддзе пытанні развіцця біялагічнай навукі сістэмна разглядалася на рэспубліканскім узроўні. Першы раз пасля жнівеньскай сесіі УАСГНІЛ у верасні 1948 г. Бюро ЦК КПБ прыняло рашэнні па «ўкараненні мічурынскай аграбіялогіі ў БССР». Сярод прынятых пастаноў было і рашэнне аб неабходнасці актывізацыі падрыхтоўкі навукоўцаў па прыродазнаўчых навуках [27, арк. 491]: дазвалялася прыняць у аспірантуру па-за межамі плана 15 чалавек [27, арк. 8].

У красавіку 1952 г. пытанні развіцця Інстытута біялогіі разглядаліся на пасяджэнні Бюро ЦК, якое прыйшло да высновы пра нездавальняючы ўзровень работы даследчай установы [28, арк. 7]. Асаблівая ўвага звярталася на парушэнне прынцыпаў кадравай палітыкі [28, арк. 17]. У дакладной запісцы, падрыхтаванай у аддзеле навукі і ВНУ, актуалізавалася пытанне падрыхтоўкі навуковых кадраў. Яе аўтары лічылі, што гэты накірунак работы з'яўляўся адным з найбольш праблемных у Інстытуце. Таксама эфектыўнасць гэтага накірунку работы актуалізавалася сакратаром ЦК М.С. Патолічавым, які не толькі акцэнтаваў яго важнасць, але і паставіў пад сумненне якасць навуковага кіраўніцтва, а таксама выказаў меркаванне пра незацікаўленасць вядучых навукоўцаў-біёлагаў і «хуткім росце маладых кадраў» [28, арк. 110].

Па ўстановах біялагічнага профілю, як і па большасці НДІ АН БССР, у пасляваеннае дзесяцігоддзе адзначаецца некалькі хваль росту. Першая адносіцца да сярэдзіны 1940-х гг. і звязана з аднаўленнем арганізацыйнай асновы Акадэміі навук і паўторнай інстытуцыяналізацыяй сістэмы падрыхтоўкі кадраў. Другая (першая палова 1950-х гг.) – са стварэннямі ўмоў для фарсіраванай падрыхтоўкі навукоўцаў, у тым ліку ў галіне прыродазнаўчых навук. Заўважу, што ў сярэдзіне 1940-х – сярэдзіне 1950-х гг. перманентна існавала праблема падбору кандыдатур аспірантаў. Дзейная мадэль прэскрэптыўна артыкулявала прыём у аспірантуру спецыялістаў,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

якія мелі вопыт практычнай работы. Зразумела, што ў пасляваеннай БССР знайсці такіх людзей, здольных да навукі, было даволі складана. Сітуацыя пачала паляпшацца ў другой палове 1940-х гг. пасля першых выпускаў беларускіх ВНУ. Аднак і ў сярэдзіне 1950-х гг. існавалі складанасці з наборамі. Напрыклад, у жніўні 1955 г. Прэзідыум АН БССР звяртаў увагу на нездавальняльны ўзровень прыёмнай кампаніі ў Інстытуце біялогіі [29, арк. 23–24]. Найбольшыя складанасці былі звязаны з падборам кандыдатур па спецыяльнасцях, якія слаба карэляваліся з накірункамі падрыхтоўкі ў ВНУ рэспублікі.

Важнейшым чыннікам эфектыўнасці сістэмы падрыхтоўкі кадраў з'яўляецца абарона суіскальнікамі дысертацыйных даследаванняў.

Табліца 3 – Дынаміка абарон кандыдацкіх дысертацый аспірантамі і супрацоўнікамі Батанічнага сада і Інстытута біялогіі АН БССР (1945–1955 гг.)

| **Год** | **План абарон** | **Колькасць абарон** | | | **% выканання** |
|---|---|---|---|---|---|
| | | **АН БССР** | **БДУ** | **Усяго** | |
| 1945 | 0 | 0 | 0 | 0 | |
| 1946 | 0 | 0 | 0 | 0 | |
| 1947 | 0 | 0 | 0 | 0 | |
| 1948 | 1 | 0 | 1 | 1 | **100,0 %** |
| 1949 | 6 | 0 | 0 | 0 | **0,0 %** |
| 1950 | 6 | 1 | 0 | 1 | **16,7 %** |
| 1951 | 3 | 0 | 1 | 1 | **33,3 %** |
| 1952 | 4 | 0 | 1 | 1 | **25,0 %** |
| 1953 | 4 | 0 | 4 | 4 | **100,0 %** |
| 1954 | 2 | 1 | 4 | 5 | **250,0 %** |
| 1955 | 2 | 2 | 3 | 5 | **250,0 %** |
| **Усяго** | **28** | **4** | **14** | **18** | **64,3 %** |

*Заўвага:* Аспіранты і супрацоўнікі Інстытута біялогіі маглі абараняць дысертацыі на суісканне ступені кандыдата і доктара навук як за межамі БССР, так і ў БДУ і ў сваёй даследчай установе (з пачатку 1950-х гг.). Дынаміка абарон рэканструявана на падставе архіўных дакументаў, аўтарэфератаў дысертацый, а таксама «Бібліяграфіі дысертацый» за 1945–1955 гг. [21], [23], [30], [31].

Падкрэслю, што падлікі, прадстаўленыя ў табліцы, не з'яўляюцца дакладнымі, а толькі адлюстроўваюць асноўныя тэндэнцыі. Не былі выяўлены абароны па-за межамі БССР, якія, як сведчаць архіўныя дакументы, планаваліся ў МДУ імя М. Ламаносава і НДІ АН СССР. Планаванне абарон, асабліва ў гады аднаўленчай пяцігодкі, сведчыць пра праекты хуткага забеспячэння акадэмічнай навукі і ВНУ кваліфікаванымі кадрамі – кандыдатамі навук, а таксама карэлюецца з планамі навучання аспірантаў і напрамкамі функцыянавання інстытута экстэрнату. Некаторае змяншэнне планаў на першую палову 1950-х гг. – з правіламі папярэдніх праектаў.

Увогуле камплектаванне беларускай навукі кваліфікаванымі спецыялістамі стаяла на парадку дзённаму ўвесь перыяд. Асабліва пільная ўвага дырэктыўных інстытутаў кіравання была накіравана на грамадскія навукі, а таксама на перспектыўныя напрамкі даследаванняў, у тым ліку і на біялогію. Пік гэтай увагі адносіцца да другой паловы 1940-х гг. і звязаны з укараненнем нарматыўнай метадалогіі «мічурынскай аграбіялогіі». Ва ўсіх дысертацыях рэфрэнам гучалі цытаты класікаў савецкай навуковай метадалогіі, вытрымкі з палітыка-праграмных актаў, абавязкова шырока згадваліся работы І.У. Мічурына і Т.Д. Лысенкі. Пасля «пагрому» генетыкі ў БССР у акадэмічных інстытутах разгарнулася кампанія па перагляду планаў НДР: толькі за 1948–1951 гг. былі кардынальна зменены тэмы 6 аспірантаў [12, арк. 92]. Зразумела, на гэта ўплывалі не толькі палітычныя працэсы, але і змены навуковых кіраўнікоў, трансфармацыі планаў НДР, страта актуальнасць даследавання.

Важнейшай часткай работы маладога навукоўца з'яўляўся вопытна-эксперыментальны этап, падчас якога пацвярджаліся альбо абвяргаліся навуковыя гіпотэзы. Для аспірантаў, якія спецыялізаваліся па розных накірунках батанікі, ён займаў не менш чым адзін вегетацыйны сезон. Яго рэалізацыя прадугледжвала наяўнасць матэрыяльна-тэхнічнай базы: насення, вегетацыйнага павільёну і (альбо) вопытнага поля, угнаенняў. Таму даволі часта біёлагам працягваўся тэрмін навучання на тэрмін да 6 месяцаў [32, арк. 421].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Агульныя тэндэнцыі абарон дысертацый па біялагічных навуках карэлюецца з працэсамі атэстацыі навуковых кадраў у Акадэміі навук. У другой палове 1940-х гг. колькасць абарон мінімальная, што тлумачыцца складанасцямі з падборам здольных да навукі кадраў у аспірантуру, слабай арганізацыяй навучання ў аспірантуры, цяжкасцямі з падрыхтоўкай і абаронай дысертацый. Зразумела, што такая сітуацыя не адпавядала стратэгічным устаноўкам развіцця беларускай навукі. З пачатку 1950-х гг. адбываецца рост колькасці абарон, што тлумачыцца шэрагам фактараў. Перш за ўсё, пасля пастановы ЦК УКП(б) «О подготовке научно-педагогических и научных кадров через аспирантуру» (май 1948 г.) некалькі трансфармуецца разуменне выніковасці работы аспіранта, што адлюстравана ў Палажэнні «Аб аспірантуры Акадэміі навук Беларускай ССР» (1950 г.). Нарматыўна-прававыя акты акцэнтавалі ўвагу на неабходнасць абароны альбо прадстаўлення дысертацыі падчас навучання ў аспірантуры. Разам з гэтым аспірант не быў абавязаны друкаваць артыкулы па выніках сваёй даследчай работы. Па-другое, з канца 1940-х – пачатку 1950-х гг. пачынаюць функцыянаваць саветы, якая мелі права прымаць дысертацыі. Нягледзячы на тое, што і ў Інстытуце біялогіі існаваў такі савет, пераважная большасць абарон праходзіла ў БДУ. Па-трэцяе, у першай палове 1950-х гг. адбываецца «кампенсаторны рост», які праявіўся за кошт абарон дысертацый аспірантамі, якія скончылі навучанне ў другой палове 1940-х гг. Таксама трэба адзначыць паляпшэнне арганізацыі навучання ў аспірантуры, што ствarала магчымасці для якаснага атрымання адукацыі. Кандыдацкія дысертацыі аспірантаў Інстытута біялогіі рыхтаваліся пад кіраўніцтвам найбольш кваліфікаваных яго супрацоўнікаў. Найбольш актыўны ўдзельнічалі у падрыхтоўцы маладых навукоўцаў акадэмікі Ц.М. Годнеў і М.В. Турбін, члены-карэспандэнты М.А. Дарожкін і М.П. Тамін.

Павелічэнне колькасці абарон сведчыла пра змены падыходаў у дзяржаўнай кадравай палітыцы ў галіне навукі, паляпшэнне арганізацыі навучання ў аспірантуры і стварэнне ўмоў для напісання навуковых тэкстаў. Аднак якасць даследчых работ і культура навуковага даследавання не маглі ў такія тэрміны так кардынальна змяніцца, асабліва ва ўмовах існавання адзінай нарматыўнай «нармальнай» навукі і фактычнай адсутнасці змен у навуковай праграме.

Калі ў сярэдзіне 1940-х – сярэдзіне 1950-х гг. пытанне фарміравання «сярэдняга навуковага звяна» ва ўмовах дзейнай тады сістэмы даследчых і вышэйшых навучальных установ было ў цэлым вырашаны, то камплектаванне беларускай біялагічнай навукі дактарамі навук заставалася адкрытым. Так, у пасляваеннае дзесяцігоддзе перыяд ні адзін з супрацоўнікаў Інстытута біялогіі не абараніў доктарскай дысертацыі. Толькі кандыдат біялагічных навук І.М. Сяржанін у 1955 г. прадставіў у вучоны савет БДУ дысертацыю «Млекопитающие Белоруссии и их хозяйственное значение», якая будзе абаронена толькі ў 1957 г.

**Высновы.**

**I.** Развіццё беларускай навукі ў пасляваенныя гады патрабавала паскарэння інстытуцыяналізацыі прыродазнаўчых дысцыплін. Першым акадэмічным цэнтрам стаў Батанічны сад, а з 1947 г. – Інстытут біялогіі. Нягледзячы на шматлікія праекты раздзялення гэтай навуковай установы, да сярэдзіны 1950-х гг. яе дзейнасць насіла комплексны характар з акцэнтам на батанічныя дысцыпліны. Планы рэфармавання Інстытута, якія прапаноўваліся кіраўніцтвам Акадэміі навук, камісіямі АН СССР, інстытуцыямі ЦК, сведчаць пра пільную ўвагу да біялагічнай навукі і неабходнасць актывізацыі распрацоўкі новых навуковых накірункаў. Таксама ўзровень развіцця прыродазнаўчых навук у БССР значна адставаў не толькі ад даследаванняў у НДІ АН СССР, але і некаторых саюзных акадэмій, што патрабавала неадкладных мерапрыемстваў па арганізацыйна-кадравых пытаннях.

**II.** Неабходнасць развіцця біялагічных навук патрабавала хуткага аднаўлення сістэмы падрыхтоўкі кадраў. З улікам адраджэння Батанічнага сада ўжо з 1945 г. зноў адкрываецца аспірантура, таксама існаваў і экстэрнат, які дазваляў супрацоўнікам Інстытута здаваць кандыдацкія экзамены. Планаванне, асабліва на 1946–1950 гг., адлюстроўвала “дух” аднаўленчых працэсаў у савецкай эканоміцы і навуцы і прадугледжвала хуткі рост кадраў маладых даследчыкаў. Аднак слабая эфектыўнасць работы сістэмы падрыхтоўкі кадраў не дазволіла гэта зрабіць. У першай палове 1950-х гг. за кошт павелічэння набораў значна

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўзрастае агульная колькасць аспірантаў, прычым павышаецца выніковасць работы аспірантуры. У сярэдзіне 1950-х гг. у цэлым вырашаецца пытанне падрыхтоўкі кандыдатаў навук, аднак сітуацыя з дактарамі навук працягвае заставацца складанай.

Менавіта ў пасляваеннае дзесяцігоддзе былі закладзены як інстытуцыянальныя, так і кадравая асновы мадэрнізацыі біялагічнай навукі ў БССР, зроблены арганізацыйна-кадравы задзел для станаўлення паразіталогіі, біяфізікі, цыталогііі.

**Літаратура**


1. Наука в БССР за 30 лет / Н. И. Гращенков [и др.] ; под ред. Н. И. Гращенкова. – Минск, 1949. – 594 с.
2. Навука ў БССР за 40 год / В. Ф. Купрэвіч [і інш.] ; пад рэд. В. Ф. Купрэвіча. – Мінск, 1959. – 475 с.
3. Навука ў БССР за 50 год / Н. А. Барысевіч [і інш.] ; пад рэд. Н. А. Барысевіча. – Мінск, 1969. – 492 с.
4. Купревич, В. Ф. Академия наук Белорусской ССР : очерк истории и деятельности / В. Ф. Купревич. – Минск : Наука и техника, 1968. – 158 с.
5. Галенчик, Н. И. Подготовка научных кадров в Белорусской ССР и их творческий вклад в развитие науки 1943–1965 гг. : дис. ... канд. ист. наук : № 571 / Н. И. Галенчик ; Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т истории. – Минск, 1970. – 241 с.
6. Токарев, Н. В. Академия наук Белорусской ССР : годы восстановления и развития (1945–1991) / Н. В. Токарев. – Минск : Беларус. навука, 2016. – 245 с.
7. Корзенко, Г. В. Научная интеллигенция Беларуси в 1944—1990 гг. : (подготовка, рост, структура) / Г. В. Корзенко. – Минск : Fico, А-СКАД, 1995. – 74 с.
8. Корзенко, Г. В. Подготовка научных кадров в Беларуси. Взгляд сквозь годы / Г. В. Корзенко. – Минск : Белорусское издательское Товарищество «Хата», 1998. – 166 с.
9. Академия наук БССР / Н. А. Борисевич [и др.] ; под ред. Н. А.Борисевича. – Минск : Белорус. сов. энцикл., 1979. – 598 с.
10. Несветайлов, Г. А. Социально-экономический механизм обновления академической науки : автореф. дис. … д-ра социол. наук : 22.00.06 / Г. А. Несветайлов. – Минск, 1990. – 46 с.
11. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – Ф. 1. Спр. 502. Арк. 133.
12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 81. Спр. 563. Арк. 113.
13. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Спр. 107. Б/н.
14. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Спр. 127. Б/н.
15. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Спр. 505. Том 2. Арк. 233.
16. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 47. Спр. 243. Арк. 455.
17. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Спр. 161. Арк. 94.
18. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 81. Спр. 591. Арк. 122.
19. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 73. Спр. 131. Б/н.
20. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 81. Спр. 887. Арк. 246.
21. ЦНА НАНБ. – Ф. 1г. Спр. 74. Б/н.
22. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Спр. 124. Арк. 25.
23. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Спр. 150а. Арк. 63.
24. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 61. Спр. 411. Арк. 103.
25. Высшая школа: Основные постановл., приказы и инструкции / Сост. М. И. Мовшович. – М. : «Сов. наука», 1957. – 562 с.
26. Аб становішчы і мерах палепшання падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў праз аспіранутуру ў Беларуская ССР // Камуніст Беларусі. – 1952. – №1. – С. 59–62.
27. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 81. Спр. 79. Арк. 491.
28. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 81. Спр. 563. Арк. 113.
29. ЦНА НАНБ. – Ф. 1г. Спр. 135. Арк. 154.
30. Библиография диссертаций, защищенных в Белорусской ССР за 1945–1955 годы. – Минск : Изд-во АН БССР, 1958. – 87 с.
31. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 73. Спр. 5. Арк. 266.
32. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Спр. 693. Т. 1. Арк. 421.


Брестский государственный
университет им. А.С. Пушкина

Поступила в редакцию 16.04.2021

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ